проект в образовательный процесс вуза как постоянную часть системы дополнительного образования и позволит повысить уровень экологической культуры студентов.

### Литература


1. Асафова, Е. В. Воспитание и диагностика развития экологической культуры студентов / Е. В. Асафова // Приоритетные стратегии мониторинга качества воспитания студентов ; под ред. В. И. Андреева. – Казань : Центр инновац. технологий, 2003. – С. 157–176.
2. Зверев, И. Д. Экологическое образование / И. Д. Зверев, И. Т. Суравегина ; Научно-исслед. институт содержания и методов обучения // Акад. пед. наук СССР. – М. : Педагогика, 1983. – 160 с.
3. Моисеева, Л. В. Теоретико-методологические основы экологической педагогики / Л. В. Моисеева // Материалы конференции «Успехи современного естествознания». – Академия естествознания. 2004. – № 7. – С. 67–69.



***С. А. Чаропка***

*г. Гомель, УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»*


## ВЫКАРЫСТАННЕ МУЛЬТЫМЕДЫЯ ЯК СРОДАК ПАВЫШЭННЯ ПАЗНАВАЎЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ

Развіццё інфармацыйных тэхналогій прадстаўляе сучаснаму выкладчыку ўсё больш магчымасцей для выкарыстання ў навучальным працэсе мультымедыйных сродкаў. Тэхнічныя сродкі навучання робяць магчымым стварэнне адпаведнай атмасферы, якая дазваляе зацікавіць студэнтаў, павысіць іх пазнаваўчую актыўнасць, спрыяюць лепшаму засваенню вучэбнага матэрыяла і дапамагаюць тэзісна выдзеляць найбольш важныя моманты тэмы, якая вывучаецца на лекцыйным або практычным занятку.

У пацверджанне выказанага сцвярджэння мы можам прывесці адзін з лекцыйных заняткаў мультцімедыйнага комплекса, які суправаджае курс гісторыі сярэдніх вякоў. Комплекс распрацаваны ў адной з навейшых распрацовак карпарацыі Microsoft – Sway. Па сваіх функцыянальных магчымасцях яна знешне нагадвае ўжо вядомы Microsoft Power Point, але пры гэтым па некаторых параметрах значна яго пераўзыходзіць. Microsoft называе Sway новым спосабам стварэння творчых веб-базаваных інтэрактыўных прэзентацый на смартфоне або ў веб-браўзеры. Кампанія надае Sway вялікую ўвагу і ставіць яго на адным узроўні з чатырмя ключавымі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

праграмамі для стварэння кантэнта з пакету Office: Word, Excel, PowerPoint и OneNote. Адзначаная камп'ютарная праграма змешчана ў асноўным пакеце Microsoft Office 365, яна простая ў выкарыстанні і дае даволі шырокія магчымасці для стварэння мультымедыйнай прэзентацыі. Гэтыя прэзентацыі выглядаюць выдатна як на дысплэі камп'ютара, так і смартфона або планшэта. У выніку атрымліваюцца веб-базаваныя прэзентацыі, якія могуць прыстасоўвацца амаль пад любы экран, а распаўсюджваць іх можна пры дапамозе простай спасылкі. Для захоўвання гэтых прэзентацый можна скарыстацца і адмыслова створаным для гэтага сайтам docs.com, які прадугледжвае сумесную работу з ўжо створаным кантэнтам.

Асноўнымі элементамі названага комплекса з'яўляюцца аўтэнтычныя або рэканструіраваныя выявы палітычных і культурных дзеячоў, прадстаўнікоў насельніцтва вывучаемага перыяду, гістарычныя краявіды мясцін, будынкаў, малюнкі вопраткі, абарончага і наступальнага ўзбраення, сярэдневяковая сімволіка. Бясспрэчнай заслугай мультымедыйных сродкаў з'яўляецца магчымасць шырокага выкарыстання картаграфічнага матэрыяла, схематычных і графічных аб'ектаў. Як наглядны прыклад мы можам выкарыстаць лекцыю на тэму «Францыя ў X–XIII ст.» для спецыяльнасці «Гісторыя (айчынная і ўсеагульная)». Для правядзення лекцыі з мультымедыйным суправаджэннем неабходна мець адпаведнае абсталяванне ў прыватнасці ноўтбук або нэтбук і праектар.

На першым слайдзе прэзентацыі прадстаўлены план лекцыі, паказана феадальная сімволіка дынастыі Капетынгаў. Студэнт бачыць жоўтыя лілеі на блакітным полі шчыта, якія з'яўляліся сімваламі прыналежнасці да каралеўскай улады ў сярэдневяковай Францыі і дэ-факта дзяржаўным сівалам краіны. Ведаючы гэта, студэнту ў наступным будзе лягчэй зразумець, чаму ж размяшчэнне англійскім каралём Эдуардам III на сваім шчыце лілеі стала адным з повадаў для пачатку своеасаблівага брэнду сярэднявечча – Стогадовай вайны.

На другім слайдзе студэнтам прапануюцца асноўныя крыніцы па тэме лекцыі, прадстаўлены кароткі агляд гістарыяграфічнай спадчыны вывучаемай праблемы.

На трэцім слайдзе размешчана палітычная карта Францыі пачатку X ст., дзякуючы якой мы можам убачыць глыбіню феадальнай раздробленнасці краіны, тэрыторыю каралеўскага дамена і ўладанні найбуйнейшых французскіх феадалаў, найбольш значныя гарады краіны і гандлёвыя шляхі.

Наступная група слайдаў адлюстроўвае змест знешняй і ўнутранай палітыкі першыя каралёў дынастыі Капетынгаў, што дазваляе раскрыць першае пытанне лекцыі. На слайдах прадстаўлены выявы асноўных

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

«дзеючых асоб» – французскіх каралёў Гуго Капета, Генрыха I, тэзісна абазначаны найбольш важныя падзеі.

Наступная група слайдаў дапамагае раскрыць другое пытанне, прысвечанае працэсу цэнтралізацыі Францыі ў XII – пачатку XIII ст. Паказаны выявы каралёў Людовіка VI, Людовіка VII Маладога, Філіпа II Аўгуста, Людовіка VIII Льва. Тэзісна абазначаны асноўныя падзеі перыяду іх праўлення, эвалюцыя англа-французскіх адносін, рэфарматарская дзейнасць Філіпа II, праблема альбігойства.

Картаграфічны матэрыял на гэтай групе слайдаў заклікаmake паказаць тэрытарыяльныя змены, якія адбыліся ў Францыі падчас праўлення гэтых манархаў.

Выявы наступнай групы слайдаў дапамагаюць вывучыць трэцяе пытанне, прысвечанае палітычнаму развіццю Францыі ў XIII ст. Акрамя кароткага адлюстравання найбольш значных падзей вывучаемага перыяду, дэманструюцца выявы асоб, якія адыгралі важную ролю на гэтым этапе развіцця краіны. Да іх адносяцца французскія каралі Людовік IX Святы і Філіп IV Прыгожы.

Карты сёмага і восьмага крыжовых паходаў добра адлюстроўваюць знешнепалітычныя прыярытэты Францыі ў 50–70 гг. XIII ст. Выявы архітэктурных помнікаў заклікаmake паказаць культурныя плыні ў Францыі XIII ст., больш выразна растлумачыць прычыны з'яўлення мянушкі Людовіка IX як «перыкла сярэдневяковага дойлідства».

На наступным слайдзе адлюстраваны палітычныя працэсы, якія праходзілі ў часы праўлення Філіпа III і з'яўляліся інэрцыйнымі ад папярэдняга правіцеля. Большую ўвагу звяртаем на дзейнасць Філіпа IV Прыгожага, пры якім цэнтралізацыя Францыі выйшла на новы якасны ўзровень. Выдзелены такія важныя падзеі як Бругская ютрань, «бітва шпораў» каля Куртрэ, бітва каля Мон-ан-Певель, разгледжана ўнутраная палітыка Філіпа Прыгожага. Асобны слайд паказвае развіццё канфлікта паміж французскім каралём і папствам, а затым і Ордэнам тампліераў, які істотна паўплываў на фарміраванне ў Францыі саслоўна-прадстаўнічай манархіі. Слайд дэманструе таксама структуру Генеральных штатаў і спосаб іх камплектавання.

Апошняя група слайдаў адлюстроўвае змест чацвёртага пытання лекцыі, якое звязана з сацыяльна-эканамічным развіццём Францыі ў Высокім сярэднявеччы. Адлюстравана саслоўная структура французскага грамадства, асаблівасці іерархічнай структуры феадальнага саслоўя гэтай краіны, паказаны сацыяльна-эканамічныя працэсы ў французскіх гарадах. Для лепшай ілюстрацыі развіцця эканамічнай асновы Францыі – сельскай гаспадаркі выкарыстаны выявы з помніка XV ст. «Très Riches Heures du Duc de Berry» («Пышнага часаслоўца герцага Берыйскага»).



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Завяршаецца лекцыя дэманстрацыяй слайда, на якім коратка паказаны асноўныя высновы па ўсіх пытаннях, якія былі пастаўлены для разгляду на занятку.

Такім чынам, падводзячы вынікі можна адзначыць наступныя палажэнні. Пры падрыхтоўцы мультымедыйнай лекцыі для сервіса Sway неабходна распрацаваць канкрэтную структуру прэзентацыі, якая павінна абапірацца на тэкст лекцыі і выгадна яе дапаўняць. Кожны слайд павінен адлюстроўваць сэнс той або іншай часткі лекцыйнага матэрыяла. Пры гэтым, каб пазбегнуць абстракцыі, на кожным слайдзе мусяць тэзісна прысутнічаць ключавыя фразы, якія лектар даводзіць слухачам падчас сваёй прамовы. Гэтыя тэзісныя фармулёўкі даюць магчымасць навучэнцам не толькі вылучыць галоўнае ў патоку матэрыяла лекцыі, але і паспець заканспектаваць тую або іншую інфармацыю.

Добра падрыхтаваная электронная прэзентацыя ў больш простай форме дае магчымасць уводзіць новыя вызначэнні. Лектар не губляе час на напісанне тэрмінаў на дошцы, яны ўжо загадзя падрыхтаваныя на слайдзе з поўнай фармулёўкай. Падобную сітуацыю назіраем з новымі імёнамі, прозвішчамі, датамі, якія таксама адлюстроўваюцца на слайдах. На наш погляд мультымедыйнае забеспячэнне лекцыі дазваляе слухачу атрымаць больш поўную інфармацыю і ў наступным больш удала падрыхтавацца да экзамена па адпаведнай дысцыпліне. І самае галоўнае – прэзентацыя даступна для спажыўца ў любы час.

## Літаратура

1. Францыя ў X–XIII ст. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: docs.com/stanislau-czaro. – Дата доступу: 03.02.2016.

2. Très Riches Heures du Duc de Berry. – [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу:https://commons.m.wikimedia.org/wiki/Tr%C3%A8s_Riches_Heures_du_Duc_de_Berry. – Дата доступу: 03.02.2016.

***Е. В. Чекина***

*г. Гродно, УО «ГрГУ им. Я. Купалы»*

# ФОРМИРОВАНИЕ СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКОЙ КОМПЕТЕНТНОСТИ БУДУЩИХ СПЕЦИАЛИСТОВ ОБРАЗОВАНИЯ: ЗАКОНОМЕРНОСТИ И ПРИНЦИПЫ

Готовность будущих специалистов образования к эффективной реализации собственной субъектности в актуальном социально-экономическом

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ